ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1980 г.
11 СНЕЖНЯ
ЧАЦВЕР
№ 34 (1298)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

# ПЛАНЫ ПАРТЫІ—ПЛАНЫ НАРОДА

**СТУДЭНТЫ, ВЫКЛАДЧЫКІ, СУПРАЦОЎНІКІ УНІВЕРСІТЭТА, ЯК І ЎСЕ САВЕЦКІЯ ЛЮДЗІ, З ВЯЛІКАЙ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЮ І ГАРАЧЫМ АДАБРЭННЕМ СУСТРЭЛІ ПРАЕКТ ЦК КПСС ДА XXVI З'ЕЗДА ПАРТЫІ «АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ЭКАНАМІЧНАГА І САЦЫЯЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ СССР НА 1981—1985 ГАДЫ І НА ПЕРЫЯД ДА 1990 ГОДА». ГЭТЫ ВАЖНЕЙШЫ ПАРТЫЙНЫ ДАКУМЕНТ, ЯКІ АДКРЫВАЕ НОВЫЯ ГАРЫЗОНТЫ КАМУНІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА, СТАЎ ПРАДМЕТАМ АКТЫЎНАГА АБМЕРКАВАННЯ Ў БДУ імя У. І. ЛЕНІНА.**

XXVI НАСУСТРАЧ З'ЕЗДУ




**Студэнты факультэта журналістыкі абмяркоўваюць праект ЦК КПСС да XXVI з'езда партыі.** Фота М. Дубовіка.

"Беларускі універсітэт" тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### АБ РАБОЦЕ

**па паляпшэнню захавання сацыялістычнай маёмасці ва універсітэце ішла гаворка на пасяджэнні рэктарата. Прысутныя абмеркавалі пытанне аб стане і мерах узмацнення кантролю, праслухалі даклады прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы У. І. Сіліна і галоўнага бухгалтара В. М. Маркавай.**

**І. БАРДЗІЯН.**

### СПАРТЫЎНА-МАСАВАЯ

**камісія мясцовага камітэта БДУ абмяркуе заўтра на пашыраным пасяджэнні вынікі універсітэцкай IX спартакіяды і гарадской спартакіяды «Здароўе», зацвердзіць мерапрыемствы па актывізацыі спартыўна-масавай работы сярод супрацоўнікаў універсітэта.**

**Н. ПЯТРОВА.**

### ЧАРГОВЫЯ ЗАНЯТКІ

**лекцыі-семінара «Спецыяльныя функцыі і іх дадаткі», якія вядзе дацэнт кафедры тэорыі функцый, аўтар дзвюх манаграфій А. І. Марычаў, адбыліся на фізічным факультэце. Курс лекцый разлічаны на матэматыкаў і фізікаў, аспірантаў і супрацоўнікаў, студэнтаў; зацікавіць жадаючых займацца навуковымі даследаваннямі, дапаможа набыць навыкі аналітычнага мыслення.**

**С. ІВАНОВА.**

### ЗМЯСТОЎНАСЦЮ І ПАЗНАВАЛЬНАСЦЮ

**вызначаюцца мерапрыемствы, якія праводзяцца на факультэце журналістыкі куратарамі першай і другой груп І курса Л. М. Няхай і М. Р. Каваленкам. Нядаўна студэнты пабывалі на экскурсіі ў аддзеле рэдкай кнігі універсітэцкай бібліятэкі, прагледзелі цікавыя мініяцюрныя выданні.**

**А. ГЕРМАНОВІЧ.**

### У СУВЯЗІ

**з адкрыццём камсамольска-маладзёжнага кафэ камітэт камсамола універсітэта запрашае выказваць прапановы па яго назве. Пераможца конкурсу будзе ўдзельнікам урачыстага адкрыцця кафэ.**

**А. СЦЯПАНАЎ.**

## Уклад відавочны

**«УСЯМЕРНА САДЗЕЙНІЧАЦЬ ДАЛЕЙШАМУ РАЗВІЦЦЮ МАСАВАЙ НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЙ ТВОРЧАСЦІ ВЫНАХОДНІКАЎ І РАЦЫЯНАЛІЗАТАРАЎ. УЗМАЦНІЦЬ РОЛЮ НАВУКОВА-ТЭХНІЧНЫХ ТАВАРЫСТВАЎ У ПАСКАРЭННІ НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАГА ПРАГРЭСУ».**

**(З праекта ЦК КПСС да XXVI з'езда партыі).**

АБ ДАСЯГНЕННЯХ вынаходнікаў і рацыяналізатараў універсітэта красамоўней за ўсё сведчаць лічбы. Зараз мы маем ужо 284 заяўкі на вынаходніцтвы. Значна павялічыўся працэнт станоўчых рашэнняў на выдачу аўтарскіх пасведчанняў. Іх рост можна прасачыць на стэндзе, які падрыхтаваны універсітэцкім аддзяленнем Усесаюзнага таварыства вынаходнікаў і рацыяналізатараў. У 1977 годзе са 177 пададзеных заявак станоўчае рашэнне атрымалі 88, у 1979 годзе з 270—159, а сёлета ўжо атрымана 189 станоўчых рашэнняў.

Асноўная наша апора — вынаходнікі з вялікім стажам: член-карэспандэнт АН БССР, дырэктар НДІ ФХП В. В. Свірыдаў; загадчык кафедры фізічнай хіміі, прафесар А. А. Вечар, загадчык вучэбных майстэрань М. І. Юзафовіч. На іх раўняецца і моладзь. Можна адзначыць цікавыя даследаванні асістэнта кафедры ядзернай фізікі У. М. Лінёва, перспектыўныя пошукі В. М. Навумчыка. Таленавітая моладзь усямерна падтрымліваецца. Нядаўна ўзнагароджаны прэміямі Ленінскага камсамола Беларусі І. А. Малевіч, загадчык лабараторыі НДІ ФХП і С. С. Вятохін, асістэнт кафедры агульнай фізікі.

**В. ЯМНЫ,**
**старшыня савета УТВР універсітэта.**

## Шпаркімі тэмпамі

**«ЗА ПЯЦІГОДДЗЕ ПАБУДАВАНЫ ЖЫЛЫЯ ДАМЫ АГУЛЬНАЙ ПЛОШЧАЙ 530 МІЛЬЕНАЎ КВАДРАТНЫХ МЕТРАЎ. ПАЛЕПШАНЫ ЖЫЛЛЁВЫЯ УМОВЫ БОЛЬШ ЧЫМ 50 МІЛЬЁНАЎ ЧАЛАВЕК».**

**(З праекта ЦК КПСС да XXVI з'езда партыі).**

ШМАТПАВЯРХОВЫ дом, пабудаваны для універсітэта ў гэтым годзе, — вельмі малая часцінка прыведзенай лічбы. Але для БДУ — гэта істотна. 107 сем'яў выкладчыкаў і супрацоўнікаў справілі наваселле мінулай вясной. У трохпакаёвую кватэру на другім паверсе новага дома пераехала і мая сям'я. Кватэра выдатная — раздзельныя пакоі і ўсе сучасныя выгоды. Вельмі зручна і тое, што дзіцячы садзік, куды мы водзім малодшую дачку, — побач з домам, а школа, у якую ходзіць старэйшая, — насупраць. На шлях да работы затрачваю ўсяго толькі 15 хвілін.

Шасцёра супрацоўнікаў гістарычнага факультэта пераехалі ў гэты дом. У тым ліку — двое з нашай кафедры.

Жыллёвае будаўніцтва ў нашай краіне будзе развівацца ранейшымі тэмпамі. У праекце ЦК КПСС запісана: **«...Паслядоўна паляпшаць жыллёвыя ўмовы савецкіх людзей, павысіць камфортнасць жылля і ўзровень яго добраўпарадкавання. Увесці ў дзеянне жылыя дамы агульнай плошчай 530—540 мільёнаў квадратных метраў».** Гэта радуе. Тым больш, што ў першым квартале наступнага года супрацоўнікі універсітэта атрымаюць яшчэ адзін шматкватэрны дом.

**Ф. МЕЛЬНІК,**
**дацэнт кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў.**

СПРАВЫ ІНТЭРНАЦКІЯ

# Дом, у якім мы жывём

СТУДЭНЦКІЯ інтэрнаты часта называюць студэнты сваім другім домам. І гэта справядліва. Дзе, як не ў інтэрнаце, праводзім мы значную частку свайго часу, рыхтуемся да заняткаў, сустракаемся з сябрамі, адпачываем. Якім жа быць нашаму дому? У значнай ступені ўзровень ідэйна-выхаваўчай, культурна-масавай і спартыўнай работы сярод студэнтаў, якія жывуць у інтэрнатах, усямернае паляпшэнне іх жыллёва-бытавых умоў, арганізацыя адпачынку і студэнцкага самаабслугоўвання залежыць ад эфектыўнасці і якасці работы студсаветаў, камендантаў, студэнцкага актыву.

На днях жыллёва-бытавая камісія прафкома сумесна з дырэкцыяй студгарадка падвяла вынікі сацыялістычнага спаборніцтва «За культурны быт» сярод інтэрнатаў універсітэта за 1980 год. Месцы сярод інтэрнатаў размеркаваліся наступным чынам:

**1-е — інтэрнат № 6**
**2-е — інтэрнат № 1**
**3-е — інтэрнат № 8**
**4-е — інтэрнат № 4**
**5-е — інтэрнат № 5**
**6-е — інтэрнат № 2.**

**Заўвага. Па-за конкурсам інтэрнаты № 7 і № 3, работа ў якіх па розных прычынах вялася не круглы год.**

Адначасова падведзены вынікі агляду-конкурсу на лепшы факультэт па арганізацыі быту і адпачынку студэнтаў, якія пражываюць у інтэрнатах. Паказчыкі тут наступныя:

**1-е — гістарычны факультэт і факультэт радыёфізікі і электронікі**

**2-е — факультэт прыкладной матэматыкі**

**3-е — юрыдычны факультэт**

**4-е — механіка-матэматычны, фізічны факультэты і факультэт журналістыкі**

**5-е — біялагічны факультэт**

**6-е — хімічны і геаграфічны факультэты**

**7-е — філалагічны факультэт.**

Як бачна, абедзве табліцы ў асноўным супадаюць. Што ж хаваецца за гэтымі лічбамі?

Пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва выйшаў інтэрнат № 6 (старшыня студсавета А. Сатолін, каменданты Е. Саламеннікава і В. Дудзіч). У кожнага, хто пабывае тут, застаецца прыемнае ўражанне. Дзейнасць студсавета будуецца на аснове комплекснага плана, у інтэрнаце праводзіцца шмат розных мерапрыемстваў. У належным стане наглядная агітацыя, ленінскі пакой, добры санітарны стан пакояў. За год у інтэрнаце не было ніводнага выпадку парушэння правілаў унутранага распарадку.

Тое самае можна сказаць і аб рабоце інтэрната № 1. Будынак інтэрната хоць і патрабуе капітальнага рамонту, але паглядзіце, якая арганізаванасць, дысцыпліна, парадак, якое цікавае жыццё ў студэнтаў гістарычнага факультэта, што пражываюць у інтэрнаце. Наогул, ранейшыя добрыя традыцыі тут захоўваюцца.

Пасля гадавога перапынку актывізавалася работа і ў інтэрнаце № 7. На жаль, студэнты філалагічнага факультэта толькі чамусьці яўна марудзяць з афармленнем ленінскага пакоя.

Разам з дадатным яшчэ сустракаюцца заганы, недахопы, ёсць нявырашаныя пытанні. Гэта асабліва яскрава можна бачыць на прыкладзе работы студсавета інтэрната № 2. Новы састаў студсавета прыкладае намаганні, каб выправіць становішча спраў, бо яго папярэднік не змог арганізаваць сваю работу. Была вялікая колькасць правапарушэнняў (за мінулы год жыллёва-бытавой камісіяй прафкома былі выселены з гэтага інтэрната 23 жыхары).

Здараліся ў інтэрнатах часам парушэнні ў рабоце ліфтоў, перабоі ў замене пасцельных прыналежнасцей. На мой погляд, прычына гэтага ў тым, што ў інтэрнаце дрэнна працуе студсавет. Ён не атрымлівае дапамогі з боку прафсаюзных бюро і камітэтаў камсамола, не кантралюецца партбюро, дэканатамі факультэтаў.

Напэўна, усе мы жадаем бачыць наш дом утульным і чыстым, каб яго жыхарам добра і цікава жылося, адпачывалася, каб пасля заканчэння вучобы застаўся добры ўспамін. Якім жа быць надалей нашаму дому? Многае тут будзе залежаць ад узроўню работы студсаветаў, студэнцкага актыву, дырэкцыі студгарадка і, напэўна, не ў меншай меры — ад свядомасці і ўзроўню культуры паводзін кожнага з нас.

**У. ШЫК,**
**старшыня жыллёва-бытавой камісіі прафкома.**

# Удасканальваць работу

СЕМІНАР «Планаванне прафсаюзнай работы ў прафбюро і прафгрупе», які быў праведзены на базе мясцовага камітэта БДУ, адкрыў сакратар абкома прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў Яўген Данілавіч Пашкевіч. Пасля кароткага паведамлення аб агульных прынцыпах і сістэме планавання работы прафсаюзнай арганізацыі універсітэта праворгі і прафсаюзныя актывісты розных падраздзяленняў падзяліліся назапашаным вопытам.

«Планаванне работы прафсаюзнага бюро. Прафсаюзны сход і прафсаюзная нарада — эфектыўны сродак мабілізацыі работнікаў ВНУ на паспяховае выкананне задач, якія стаяць перад вышэйшай школай» — тэма выступлення старшыні прафбюро механіка-матэматычнага факультэта, старшага выкладчыка Анатоля Уладзіміравіча Самсонава. Ён гаварыў аб неабходнасці ўзгаднення планаў як сродку пазбегнуць непатрэбнага паралелізму ў рабоце грамадскіх арганізацый. Складаючы план работы, прафбюро механіка-матэматычнага факультэта сваімі галоўнымі задачамі лічыць: абарону праў і інтарэсаў супрацоўнікаў факультэта, ахову працы, аказанне дапамогі адміністрацыі ва ўмацаванні дысцыпліны і паспяховасці, выхаванне ўсіх членаў прафсаюза адпаведна з маральным кодэксам будаўніка камунізму.

Асобна спыніўся выступаючы на падрыхтоўцы і правядзенні прафсаюзных сходаў і нарад.

На прыкладах дзейнасці вытворча-масавай камісіі прафбюро факультэта прыкладной матэматыкі старшыня яе, асістэнт Мікалай Мікалаевіч Труш, расказаў аб прынцыпах планавання работы камісій прафсаюзнага бюро і кантролю за выкананнем плана.

Праforg аддзела тэлеапрацоўкі даных вылічальнага цэнтра Людміла Нічыпараўна Батурына выступіла па апошняму пытанню семінара: «Прафгрупа — як асноўнае звяно ў выкананні задач, якія стаяць перад вышэйшай школай».

Зараз ідзе фарміраванне новых планаў прафсаюзнай работы, таму правядзенне такога семінара можна лічыць вельмі своечасовым.

Аналізуючы выкананне планаў падраздзяленнямі, мясцовы камітэт прыйшоў да вываду, што некаторыя пытанні і праблемы па сацспаборніцтву, па ахове працы і тэхніцы бяспекі і іншыя не знаходзілі лагічнага завяршэння, не дасягалі канчатковых вынікаў таму, што абмяркоўваліся разрознена і на некампетэнтным узроўні. Таму мясцоваму камітэту рэкамендавана ўключыць найбольш важныя пытанні ў планы наступнага года. Яны будуць абмеркаваны на пасяджэннях прэзідыума мясцкома ці адпаведных камісій.

**Г. БЯЛЬКЕВІЧ.**



**НА ЗДЫМКУ: загадчык падрыхтоўчага аддзялення А. Г. Слука, прарэктар У. С. Багданаў, намеснік дэкана гістарычнага факультэта А. Г. Кляцкоў абмяркоўваюць вынікі прыёму слухачоў на падрыхтоўчае аддзяленне.**
**Фота М. Дубовіка.**

ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА

## «ЗІМА СПЫТАЕ СТРОГА»

**У матэрыяле ўказвалася на недахопы падрыхтоўкі інтэрнатаў да эксплуатацыі ў зімовых умовах. («Беларускі універсітэт», № 31 (1295) ад 20 лістапада 1980 г.). Рэдакцыя атрымала адказ дырэктара студгарадка В. С. ЦІМОХІНА. Вось што ён паведаміў:**

«У інтэрнаце № 5 у 1981 годзе плануецца правесці капітальны рамонт. У цяперашні час рыхтуецца тэхнічная дакументацыя. У душавых наведзены парадак, на падлогу пакладзены гумавыя дываны, адрамантаваны вадаправодныя краны. Усе праходы і выхады вызвалены ад мэблі і іншага абсталявання, зашклёны вокны.

У інтэрнаце № 7 таксама вызвалены ад мэблі ўсе праходы. Зашклілі вокны. З-за адсутнасці плафонаў не прыведзена ў належны стан асвятленне інтэрната. Як толькі іх завязуць, рамонт будзе закончаны».

ТОЛЬКІ ФАКТ

# «ДЗЯКУЙ ЗА КЛОПАТ...»

**«Вялікае дзякуй за ўвагу і клопат» —гэтыя словы можна было пачуць у час урачыстага адкрыцця універсітэцкага стала заказаў ад усхваляванага першага пакупніка, калі не менш усхваляваныя супрацоўнікі гандлёвага пункта ўручылі яму заказ. Вось і першы ўдзячны запіс у кнізе водгукаў і прапаноў...**

Стол заказаў размясціўся ў корпусе падрыхтоўчага аддзялення. Універсітэт прадаставіў утульнае памяшканне, набыў абсталяванне, зрабіў рамонт. Прыгожа афармлены вітрыны, складскія пакоі (хаця ёсць патрэба яшчэ ў дадатковым — для тавараў паўсядзённага карыстання).

Які ж прынцып работы стала заказаў?

Створаны сіламі і па ініцыятыве мясцкома, АГЧ, аддзела матэрыяльнага забеспячэння, супрацоўнікаў, «стол» працуе на падставе дагавора БДУ з райхарчгандлем. Графік атрымання заказаў складаецца па падраздзяленнях і прадстаўляецца ў мясцком. Адпаведна са спісам супрацоўнікі атрымліваюць заказы прыкладна адзін раз у 20 дзён. Аб прапанаваных таварах факультэты і арганізацыі даведваюцца праз прадстаўнікоў сваіх прафбюро. Тыя, у сваю чаргу, атрымліваюць неабходную інфармацыю ў камісіі грамадскага харчавання БДУ, якую ўзначальвае загадчык кафедры тэорыі ўраўненняў матэматычнай фізікі М. І. Юрчук.

Арганізаваны з мэтай задавальнення патрэб на прадукты харчавання павышанага запытання, пэўнай эканоміі часу ад вядомай «бегатні» па магазінах і прастойвання у чэргах, стол заказаў разлічаны на ўсіх супрацоўнікаў універсітэта.

— Асартымент тавараў,— гаворыць загадчыца «стала» Надзея Міхайлаўна Пальчык,— самы шырокі. Тут прадстаўлены як самыя неабходныя для гаспадыні, «штодзённыя» прадукты — цукар, малако і г. д., так і скамплектаваныя заказы, якія можна атрымаць па сістэме заказаў, гэта значыць, пакупка павінна складацца з трох назваў. Выдача заказаў адбываецца з 14 да 16 гадзін, у астатні ж час стол працуе як звычайны магазін.

Пакуль што ў новай арганізацыі ёсць свае цяжкасці — няма пэўных фондаў, больш увагі трэба ўдзяляць інфармаванню супрацоўнікаў аб наяўнасці заказаў і г. д. Але ёсць надзея, што гэтае карыснае пачынанне апраўдае сваё прызначэнне.

**І. САВЕТКІНА,**
**наш кар.**

АБМЕН ВОПЫТАМ

# ЗНАЙШЛІ НОВЫХ СЯБРОЎ

ГАСЦЯМІ Вільнюса былі студэнты БДУ, члены савета дружбы гістарычнага факультэта. Беларускіх гасцей цёпла сустрэлі гаспадары — студэнты Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта імя Капсукаса. У першы дзень экскурсаводы пазнаёмілі са славутымі мясцінамі і гістарычнымі помнікамі сталіцы: старым горадам, башняй Гедымінаса. Затым дэлегацыя была запрошана на фальклорны вечар, які праводзіўся ў студэнцкім кафэ аднаго з вучэбных карпусоў універсітэта. Стрыжнем праграмы стала выступленне фальклорнага ансамбля. У час гэтага вечара прадстаўнікі беларускай дэлегацыі абмяняліся вопытам з адказнымі за інтэрнацыянальную работу Вільнюскага універсітэта. Было прынята рашэнне аб расшырэнні кантактаў паміж дзвюма ВНУ ў галіне інтэрвыхавання.

Студэнты з Мінска пазнаёміліся з жыццём сваіх калег, знайшлі шмат сяброў у сталіцы брацкай Літвы, сустрэлі шчыры клопат і зацікаўленыя адносіны да сябе.

У наступны дзень пасланцы БДУ агледзелі замак Тракай і старыя карпусы Вільнюскага універсітэта — шэдэўр старажытнай архітэктуры, якому ўжо больш 400 гадоў.

Гэты ж дзень стаў і днём развітання з гасцінным горадам. Але ўспаміны аб яго наведанні надоўга застануцца ў памяці ўдзельнікаў паездкі.

**І. ДЫСКІН,**
**студэнт III курса гістарычнага факультэта.**

● БДУ — НАРОДНАЙ ГАСПАДАРЦЫ

# БУДУЦЬ НОВЫЯ ВЫШЫНІ

ЯК І ЎСЁ У СВЕЦЕ, навука развіваецца скачкападобна. Рывок — і папулярызацыя. Штурм — і павольнае распаўсюджанне. Прарыў — і ўдакладненне, вывучэнне, асваенне...

Вынаходніцтва шароў-зондаў — прарыў; падзел атмасферы на некалькі сфер і пераходных слаёў — распаўсюджанне. Стварэнне апаратуры для лазернага даследавання атмасферы — прарыў; светавы сігнал, які з'яўляецца крыніцай інфармацыі стану атмасферы, — асваенне...

Прарыў рызыкоўны — гэта скачок у невядомае. Абяцае залатыя горы, не заўсёды апраўдвае працу. Асваенне надзейна, як уклад у ашчадную касу. Але не было б прарыву — што асвойваць, уласна кажучы?

У нашу эпоху, у век навуковай індустрыі на прарыў ідуць не асобныя смельчакі, а навуковыя інстытуты. Для асваення ж патрэбны людзі, радавыя працаўнікі навукі.



Сціпласць — гэта іх асноўная рыса. Уседлівыя, працалюбівыя, з незвычайнай памяццю. Звычайна, круглыя выдатнікі з першага класа да дзесятага...

СТАРШЫ навуковы супрацоўнік лабараторыі аналага-лічбавых метадаў вымярэння Уладзімір Ігаравіч Іваноў і старшы інжынер лабараторыі паўправадніковай электронікі НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі Канстанцін Паўлавіч Утачкін працуюць разам. Іх цікавіць адна важная праблема — даследаванне атмасферы.

Уладзімір і Канстанцін займаюцца распрацоўкай новых метадаў і стварэннем сучасных інфармацыйна-вымяральных сістэм аўтаматызацыі лазерна-лакацыйных вымярэнняў параметраў атмасферы. Іх распрацоўкі вядуцца на аснове накопленага ў тэхнічнай кібернетыцы і тэорыі інфармацыі вопыту і навейшых дасягненняў сучаснай радыёэлектронікі. Што ж гэта за сістэмы і навошта яны патрэбны?

АЭРАЗОЛІ. Дробныя часцінкі, якія звычайна знаходзяцца ў атмасферы. Калі яны вадкія, аэразолі называюцца туманам, калі цвёрдыя — дымам і пылам. Утвараюцца яны ў розных прыродных і вытворчых працэсах: каля вадаспадаў, пры кандэнсацыі перанасычанай пары, пры пэўных хімічных рэакцыях і фізічных працэсах. Яны часта выкарыстоўваюцца ў медыцыне, сельскай гаспадарцы. Аднак утварэнне аэразолей часта непажаданае. Напрыклад, у металургіі, цэментавай, хімічнай прамысловасці і іншых галінах, дзе пыл выносіць каштоўныя рэчывы. Але больш страшна тое, што ён забруджвае паветра: шкодна дзейнічае на здароўе людзей, механізмы. Акрамя гэтага, узрастаючая канцэнтрацыя стратасферных аэразолей, а таксама павышанае знаходжанне ў атмасферы вуглякіслага газу і вокісу вугляроду акazваюць уплыў на клімат Зямлі. Яны выклікаюць павышэнне сярэдняй тэмпературы паветра, памяншаецца бачнасць, павялічваецца колькасць ападкаў. І гэта можа нават прывесці да змен цеплавога балансу планеты.

Таму зараз адна з найбольш важных праблем, якія стаяць перад фізікамі, — разбурэнне аэразоляў для ачысткі атмасферы. А гэта патрабуе прымянення высокаапэратыўных метадаў даследавання атмасферы з высокай ступенню аўтаматызацыі працэсаў. Метады лазернага зандзіравання атмасферы найбольш поўна адпавядаюць указаным патрабаванням. Яны маюць шэраг пераваг у параўнанні з традыцыйнымі кантактнымі метадамі: дыстанцыйнасць, вялікая дальнасць дзеяння, эканамічнасць. Пры кантактным метадзе атмасферу вывучаюць з дапамогай аэрастатаў, шароў-зондаў, радыёзондаў і самалётаў. Спачатку бяруць пробу, а потым праводзяць хімічны аналіз. Вядома, вынікі могуць быць недакладнымі: парушаецца шчыльнасць паветра, яго тэмпература, а на даследаванне нават невялікага ўчастка ідзе шмат часу. Пры вывучэнні ж атмасферы над раёнамі горада Масквы напярэдадні Алімпійскіх гульняў эксперымент праводзіўся ўсяго 2 тыдні. У ім, дарэчы, прымаў удзел К. Утачкін. Калі б дослед праводзіўся кантактным метадам, трэба было б затрацiць не адзін год.

ЛАЗЕРНЫЯ метады. У чым жа іх сутнасць? Гэта даследаванне заснавана на выкарыстанні розных эфектаў узаемадзеяння монахраматычнага аптычнага выпраменьвання з атмасферай. Крыніцай інфармацыі аб стане атмасферы з'яўляецца прымаемы вымяральнай сістэмай светавы сігнал рассейвання. Гэта значыць, прылада, або, як яе называюць, «інфармацыйна-вымяральная сістэма», выпраменьвае пучок святла, які праходзіць па трасе і даследуе атмасферу да вышыні больш як 100 кіламетраў. Прычым інфармацыю можна атрымаць з любога пункта даследуемага ўчастка. Дайшоўшы да зададзенай вышыні, эха-сігнал вяртаецца на Зямлю, потым апрацоўваецца. Так вучоныя даведваюцца аб стане атмасферы патрэбнага ім раёна.

Пры дапамозе гэтага метаду складзены буйнамаштабныя карты атмасферы над Ленінградам, Мінскам, Магілёвам, Бабруйскам...

Эканамічны эфект ад распрацаваных сістэм лазернай дыягностыкі атмасферы




склаў каля чатырох мільёнаў рублёў.

НАДЗВЫЧАЙНАЯ працаздольнасць, нястомнасць у пошуку характэрны для Уладзіміра Іванова і Канстанціна Утачкіна. Пад кіраўніцтвам Уладзіміра распрацаваны шэраг тэм, якія абаронены 10 аўтарскімі пасведчаннямі. Створаны і ўкаранёны ўзоры інфармацыйна-вымяральных сістэм. Маладымі вучонымі распрацавана і выкарыстоўваецца радыёнакіроўваемая шматканальная вымяральная сістэма для даследавання атмасферы са стратасферных станцый. Канстанцін за час работы ў інстытуце апублікаваў 12 навуковых артыкулаў. Вынікі іх работ дакладваліся на IV і V Усесаюзных сімпозіумах па распаўсюджанню лазернага выпраменьвання ў атмасферы (Томск, 1977 і 1979 гг.), на Усесаюзнай навукова-тэхнічнай канферэнцыі «Праблемы распрацоўкі аўтаматызаваных сістэм назірання, кантролю і ацэнкі стану навакольнага асяроддзя» (Казань, 1979 г.). Распрацаваныя Уладзімірам і Канстанцінам, ці з іх дапамогай, сістэмы выкарыстоўваюцца ў цяперашні час у вядучых навуковых цэнтрах па вывучэнню параметраў атмасферы.

Не перастаеш здзіўляцца шырыні іх інтарэсаў. З 1973 года Уладзімір кіруе навуковай групай, адказваў за правядзенне філасофскіх семінараў сярод навуковых і інжынерна-тэхнічных работнікаў НДІ ПФП, арганізацыю сацыялістычнага спаборніцтва, культурна-масавую работу; Канстанцін кіруе курсавымі і дыпломнымі работамі студэнтаў, працаваў у саставе СБА на будоўлях Казахстана і Комі АССР...

Калі я спытала пра маладых вучоных у загадчыкаў лабараторыі І. А. Малевіча і М. І. Дземчука, пад кіраўніцтвам якіх працуюць Уладзімір і Канстанцін, яны коратка адказалі: «Выдатныя рабяты, таленавітыя вучоныя». Пажадаем жа У. Іванову і К. Утачкіну поспехаў у іх карысанай і цікавай справе. І, вядома, новых рыўкоў, новых штурмаў, новых перамог...

**Н. ЖУКАВА,**
**наш кар.**



**На здымках:** Уладзімір **Іваноў** і Канстанцін **Утачкін** у лабараторыі сярод сваіх калег; малодшы навуковы супрацоўнік **У. Габрусеў** і старшыя інжынеры **В. Скамарошчанка** і **М. Свінцілаў** за наладкай апаратуры для лазернага зандзіравання атмасферы.

Фота **М. Дубовіка.**

РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ

# ШЧАСЛІВАЙ ДАРОЖКІ!

ХВІЛІНЫ, хвіліны, хвіліны... Яны складваюцца ў гадзіны, дні.

Пот засцілае вочы... Здаецца, ужо зусім няма сіл. Аддадзена ўсё. А наперадзе яшчэ палова трэніроўкі. Яшчэ цэлая палова!

— Не забывайся працаваць рукамі! Так, так, шырэй крок! Яшчэ шырэй! Вось так! Малайчына!

Крокі, крокі, крокі... Зноў і зноў, як у тумане. І ў свядомасці застаюцца толькі адрэзкі. Адрэзкі дыстанцыі. Ты ўяўляеш іх сабе, адчуваеш кожны іх сантыметр. Нават колер. Сапраўды, у кожнай свой колер... Дзвесце метраў — сіняя прыгажуня. Два віражы — і вось ён, доўгачаканы фініш. Пяцьсот метраў — нядобрая чараўніца, якая ўпарта не хоча адпускаць цябе, нашэптваючы, здаецца, на самае вуха: «Яшчэ віраж! Яшчэ адзін!»

Трэніроўкі змяняюць адна другую, а яна, наш трэнер і настаўнік, майстар спорту СССР Валянціна Васільеўна Зарэцкая заўсёды з намі. Яна побач. І кожнае яе слова, кожная парада — дапамога.

— Дзяўчаты! — гаворыць яна, як заўсёды, ветліва, але патрабавальна. — Ну пацярпіце яшчэ крыху, гэта ж зусім не цяжка. Мне здаецца, што ўсю работу я б змагла зрабіць за вас сама.

Канешне, Валянціна Васільеўна крыху перабольшвае, але мы верым ёй, верым кожнаму яе слову, і нам становіцца крыху сорамна. І сапраўды...

Упершыню яна выйшла на лёгкаатлетычную дарожку яшчэ ў той час, калі вучылася ў Пружанскай сярэдняй школе. І там жа, у класе дзевятым, упершыню стала чэмпіёнкай рэспублікі ў бегу на 400 метраў. У той час на яе глядзелі як на нейкае цуда. Бо, як вядома, чатырохсотметровая дыстанцыя вельмі цяжкая. Яна патрабуе ад спартсмена хуткасці спрынтэра-стометроўкі і хуткаснай вынослівасці бегуна на сярэдніх дыстанцыях. Вось чаму здзіўляла тады ўсіх худзенькая пятнаццацігадовая дзяўчынка, у якой быў па-сапраўднаму байцоўскі спартыўны характар. А потым Валянціна Васільеўна (а тады проста Валя) уваходзіць у састаў зборнай рэспублікі. Пасля заканчэння школы яна паступае ў інстытут фізічнай культуры, становіцца майстрам спорту... І вось яна — мэта жыцця. У 1958 годзе В. В. Зарэцкая становіцца чэмпіёнкай СССР і ўваходзіць ў састаў зборнай краіны па лёгкай атлетыцы.

Прайшлі гады. Зараз яна трэнер. Уважлівы і чулы. І, напэўна, калі б прыйшлося пачынаць жыццё зноў, то не здрадзіла б сабе — зноў лёгкая атлетыка. Зноў трэніроўкі, зноў удачы і цяжкасці. Адным словам — неспакойнае жыццё спартсмена. А было яно сапраўды насычаным: Балгарыя, Куба, ГДР...

Апошнія тры гады, калі яна была членам зборнай краіны, Валянціна Васільеўна трэніравалася па ўласна распрацаванай методыцы. Гэта і была першая яе трэнерская спроба.

...Было гэта нядаўна. Па мерках іншых. Было гэта даўно. Здаецца ёй самой. І нават прайшла для яе цэлая вечнасць з апошніх у яе жыцці спаборніцтваў, з апошняга старту ў Ленінакане, дзе яна атрымала траўму. Тады яна ішла па стадыёну і глядзела на сваю «чатырохсотметроўку», такую родную і... плакала, шчыра, па-дзіцячаму, бо назаўсёды палюбіла гэтую дыстанцыю, спорт. Яна магла яшчэ стартаваць, але ўрачы катэгарычна забаранілі.

І зноў лёгкаатлетычны манеж, група, у якой я займаюся. І зноў я бачу Валянціну Васільеўну Зарэцкую. За гады працы ва універсітэце яна падрыхтавала шмат добрых спартсменаў. І сёлета, як і ў пачатку кожнага года, у яе паявіўся дадатковы клопат: у нашу групу прыйшлі «навічкі». Пасвячэнне іх адбылося на восеньскім агульнауніверсітэцкім кросе. Ганна Лебядзевіч выйграла сярод першакурснікаў, а Генадзь Лайко ўвайшоў у тройку прызёраў. Няхай ва бегавая дарожка будзе і для іх па-сапраўднаму шчаслівай.

**А. ЛУКАШЭВІЧ,**
**студэнтка журфака.**

# ЭКСПРЭС-ІНФАРМАЦЫЯ

**НА ЧАРГОВЫМ ПАСЯДЖЭННІ кафедры фізічнага выхавання і спорту разгледжана пытанне аб выкананні плана падрыхтоўкі спартсменаў-разраднікаў і грамадскіх інструктараў па спорту за 1980 год (дакладчык — старшыня спортклуба універсітэта В. П. Шапялевіч). У прыватнасці, на пасяджэнні адзначалася, што за гэты год кафедрай фізічнага выхавання і спорту падрыхтавана 7 майстроў спорту, 20 кандыдатаў у майстры спорту, 78 першаразраднікаў і 4613 спартсменаў масавых разрадаў. Былі вызначаны шляхі для больш мэтанакіраванай работы з таленавітай моладдзю і павышэнню яе спартыўнага майстэрства.**

* * *

**ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПЕРШЫНСТВО універсітэта па шашках. Упэўнена лідзіруе каманда хімічнага факультэта.**

**Вось як выглядае агульная турнірная табліца пасля шасці тураў:**

1. Хімічны факультэт — 35
2. Фізічны факультэт — 26
3. Механіка-матэматычны факультэт — 23,5
4. Факультэт прыкладной матэматыкі — 20
5. Філалагічны факультэт — 19,5
6. Радыёфізічны факультэт — 17
7. Гістарычны факультэт — 16
8. Факультэт журналістыкі — 12,5
9. Геаграфічны факультэт — 7
10. Юрыдычны факультэт — 5,5.

**Біялагічны факультэт зняты са спаборніцтваў па прычыне адсутнасці заяўкі на ўдзельнікаў.**

* * *

**АДБЫЛАСЯ VIII СПАРТЫЎНАЯ канферэнцыя спортклуба БДУ імя У. І. Леніна. Справаздача аб ёй будзе змешчана ў наступным нумары газеты.**

* * *

**СПАРТАКІЯДА ЗАМЕЖНЫХ СТУДЭНТАЎ, якія займаюцца ў БДУ імя У. І. Леніна, набірае тэмп. Ужо прайшлі спаборніцтвы па баскетболу і валейболу, у якіх перамаглі спартсмены зямляцтваў Кубы і Польшчы.**

**14 снежня зямляцтва Балгарыі праводзе розыгрыш кубка па міні-футболу. 21 снежня будзе праведзены турнір па настольнаму тэнісу, а 28 снежня —турнір па шахматах. Зборныя каманды зямляцтваў рыхтуюцца зараз да VII гарадской спартакіяды замежных студэнтаў.**

* * *

**25—26 снежня ў манежы «Дынама» адбудзецца першынство універсітэта па лёгкай атлетыцы. Прагрaмы спаборніцтваў пачынаюцца ў 19 гадзін.**

**С. ЛЫСКАВЕЦ.**

# «БРОНЗА» ВАЛЕЙБАЛІСТАК

**ЖАНОЧАЯ ЗБОРНАЯ каманда універсітэта па валейболу заняла трэцяе месца ў другім крузе першынства горада па валейболу.** У гульнях першынства прынялі ўдзел восем мацнейшых валейбольных каманд Мінска. Каманда універсітэта, якая напярэдадні паспяхова правяла гульні першынства па валейболу сярод ВНУ рэспублікі, у гэтых спаборніцтвах выступала ў значна змененым саставе. У каманду прыйшлі новыя таленавітыя спартсмены. Гэта першакурсніцы Вольга Русецкая (мехмат), Ірына Саракун (гістфак) і Ірына Рамашка (юрфак). Безумоўна, усе хваляваліся за іх, чым маглі, падтрымлівалі. Гэта наклала пэўны адбітак на агульны настрой каманды, спрыяла згуртаванасці ўсяго нашага калектыву і дапамагло дабіцца поспеху.

Фінальную гульню са зборнай політэхнічнага інстытута дзяўчаты правялі са спартыўным запалам. Вынік — перамога (3:1). Гэта дазволіла зборнай Белдзяржуніверсітэта, незалежна ад наступных гульняў, заняць ганаровае трэцяе месца, уступіўшы толькі моцным камандам інстытута фізічнай культуры і зборнай каманд школьнікаў горада Мінска. Цікава, што вось ужо на працягу дзесяці год валейбалісткі універсітэта пастаянна ўваходзяць ў тройку мацнейшых студэнцкіх каманд рэспублікі.

Асаблівa хочацца адзначыць добрую гульню капітана каманды пяцікурсніцы хімічнага факультэта Наталлі Касянковай і чацвёртакурсніцы ФПМ Лілі Паўлоўскай.

Не забываюць сваю любімую каманду і выпускніцы. Сярод іх былыя студэнткі факультэта прыкладной матэматыкі Ларыса Дубовік і Марыя Кунцэвіч. Менавіта гэтыя дзяўчаты і складаюць зараз асноўнае ядро універсітэцкай зборнай.

Наперадзе яшчэ шмат спаборніцтваў. У канцы студзеня універсітэцкая жаночая каманда па валейболу будзе прымаць удзел у традыцыйных спаборніцтвах на кубак універсітэтаў Прыбалтыкі, які адбудзецца ў Вільнюсе. А вясною будзем спрачацца за званне мацнейшай валейбольнай каманды сярод ВНУ рэспублікі.

**М. КУЧЫНСКІ.**



# Ікарам хочацца лётаць

ДЭЛЬТАПЛАНЕРЫЗМ — адзін з новых відаў спорту. У 1979 годзе ў Мінску створана рэспубліканская федэрацыя дэльтапланернага спорту пад кіраўніцтвам заслужанага майстра спорту, заслужанага трэнера СССР, неаднаразовага чэмпіёна і рэкардсмена свету па парашутнаму спорту У. Б. Гурнага. У горадзе існуе некалькі секцый: пры АН БССР, політэхнічным інстытуце, на трактарным заводзе, а таксама ў БДУ. Кіраўнік універсітэцкай секцыі Юрый Красякоў — інжынер кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл біялагічнага факультэта, пілот-дэльтапланерыст ІІ класа, яго намеснік Уладзімір Самуйлаў — інжынер кафедры фізікі паўправаднікоў, пілот-дэльтапланерыст ІІ класа. Члены секцыі — Юрый Макушок, Віка Холькіна, Ала Ігнатовіч, Алена Пісарэнка — студэнты III курса фізфака, Андрэй Сазонтаў — студэнт 2 курса ФПМ.

Заняткі дэльтапланерным спортам адкрываюць шырокія магчымасці для развіцця навукова-тэхнічнай творчасці моладзі. Напрыклад, задача аб змяненні формы крыла з адначасовай аптымізацыяй асноўных аэрадынамічных паказчыкаў патрабуе сумеснай працы фізікаў, матэматыкаў, механікаў, праграмістаў.

Год існуе секцыя, але, на жаль, адсутнічае ў яе матэрыяльна-тэхнічная база. Сёрыйная вытворчасць дэльтапланаў пакуль яшчэ не наладжана, і таму іх трэба рабіць самастойна.

Было б вельмі добра, каб грамадскія арганізацыі універсітэта звярнулі на гэта сваю ўвагу і дапамаглі секцыі ў набыцці неабходных матэрыялаў. Але нават калі і гэта пытанне будзе вырашана, то паўстане другое — не менш складанае — дзе захоўваць дэльтапланы? Уладзімір Самуйлаў гаворыць:

— Нам патрэбна якое-небудзь памяшканне, каб захоўваць там апараты. У нашай секцыі пакуль што маецца адзін дэльтаплан, створаны намаганнямі дэльтапланерыстаў на ўласныя сродкі. Зараз, пасля новага набору, секцыя расшырыла свой састаў да трыццаці сямі чалавек. Для нармальнага правядзення заняткаў пачынаючых пілотаў і павышэння класнасці неабходна стварэнне новых дэльтапланаў і адпаведна — паляпшэнне ўмоў іх захоўвання.

І тады ўзляцяць Ікары ў неба...

**Л. ТРАПЕЗНІКАВА.**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

# ПАСЛЯ ВЫСТУПЛЕННЯ ГАЗЕТЫ

«На фельетон «Пра лыжы, канькі і іншае...», які быў змешчаны 20 лістапада 1980 года, паведамляю, што ва універсітэце сапраўды маецца ўсяго 1090 пар лыжаў з чаравікамі. Зразумела, гэтага вельмі і вельмі мала. Універсітэт набыў бы яшчэ неабходную колькасць лыжаў, але дзе? На базах горада Мінска лыжнага інвентару няма. Што датычыцца канькоў, то ў хуткім часе яны будуць набыты для масавага карыстання.

Па хакею з шайбай першынство універсітэта пакуль праводзіцца не будзе па прычыне адсутнасці інвентару. Аднак першынство універсітэта па хакею з мячом будзе праведзена. Па біятлону ў цяперашні час правесці першынство універсітэта няма магчымасці.

Што датычыць базы, якая па вуліцы Кастрычніцкай, то яна сапраўды знаходзіцца ў запушчаным стане, і пакуль будуць знаходзіцца над базай душавыя пакоі, палепшыць яе не прадбачыцца. Кафедра фізвыхавання і спорту неаднаразова ставіла пытанне аб рамонце душавых пакояў, але ўказаныя газетай недахопы не былі ліквідаваны.

**С. МАКАРЭВІЧ,**
**в. а. загадчыка кафедры фізвыхавання і спорту.**



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
11 снежня 1980 г.

Заказ 1842 АТ 19560

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.
ТЭЛЕФОН 22-07-19.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ